***В. М. Бігеза,***
*кандыдат філалагічных навук*

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ КУЛЬТУРНА-ДАСУГАВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ДЗІЦЯЧЫХ БІБЛІЯТЭК

Пры наяўнасці існавання розных канцэпцый, якія характарызуюць разглядаемую праблему, спецыялісты асобна вызначаюць культуралагічную і сацыяльна-культурную канцэпцыю культурна-дасугавай дзейнасці. Менавіта ў названых канцэпцыях гэты від дзейнасці «ўспрымаецца як сфера адукацыі, выхавання асобаснай і сацыяльнай культуры, асобасных і грамадзянскіх якасцей, пашырэння культурнага кругагляду і абмену духоўнымі каштоўнасцямі, знаёмства з культурна-гістарычнымі каштоўнасцямі, спадчынай кожнага народа» [4, с. 162].

Названыя канцэпцыі ляжаць у аснове культурна-дасугавай дзейнасці дзіцячай бібліятэкі, якая адбываецца тут праз пэўна арганізаваныя зносіны, якія маюць педагагічны падтэкст, культурна-адукацыйнае, развіваючае і выхаваўчае значэнне. Менавіта ў дзіцячай бібліятэцы ствараецца асяроддзе для свабоднага самавыяўлення дзіцяці, нараджаецца атмасфера творчасці і фантазіі, якая спрыяе выхаванню.

Пытанні педагагічнай арганізацыі дасугу ў шырокім сацыякультурным аспекце распрацоўвалі Р. М. Азарава, Г. А. Яўцеева, М. Б. Зацэпіна, В. Я. Суртаеў, Б. А. Цітоў і інш.

Навукоўцы ў галіне педагогікі вольнага часу культурна-дасугавую дзейнасць вызначаюць: як спецыялізаваную падсістэму духоўна-культурнага жыцця грамадства, функцыянальна аб’ядноўваючую сацыяльныя інстытуты, якія забяспечваюць узнаўленне, выдаткаванне, захоўванне і распаўсюджванне культурных каштоўнасцей; як калектыўны і індывідуальны спосаб жыццядзейнасці людзей, у аснове якога ляжыць шматбаковая дзейнасць; як сферу жыццядзейнасці, якая адкрывае ўнікальныя ўмовы фарміравання ўнутранага свету, павышэння культуры і ўсебаковага развіцця асобы; як сродак раскрыцця і рэалізацыі сутнасных сіл чалавека; як выхаваўчую дзейнасць (А. Д. Жаркоў, Ю. А. Стральцоў, В. Я. Суртаеў, В. М. Чыжыкаў, У. Я. Трыодзін і інш.).

Бібліятэчнаму персаналу, які працуе з дзецьмі, дзеля рашэння выхаваўчых задач сродкамі культурна-дасугавай дзейнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходна абапірацца на існуючыя функцыі. На наш погляд, гэта перш за ўсё такія, як камунікатыўная, культурна-творчая, рэкрэатыўна-аздараўляльная, якія ў значнай ступені забяспечваюць духоўнае ўзбагачэнне і развіццё творчых здольнасцей.

Адначасова, па нашым меркаванні, бібліятэкарам неабходна ўлічваць таксама непарушнасць гарманічнай структуры этапаў узроставага развіцця дзіцяці, якая характарызуецца заўсёды «не проста сукупнасцю асобных псіхалагічных асаблівасцей, а своеасаблівасцю і некаторай цэласнасцю структуры асобы дзіцяці і наяўнасцю спецыфічных для дадзенага этапу тэндэнцый развіцця» [2, с. 144].

Педагагічныя аспекты культурна-дасугавай дзейнасці праяўляюцца ў далучэнні дзяцей да рэкрэацыйнай, забаўляльнай, камунікатыўнай, адукацыйнай, творчай дзейнасці, іх духоўным, інтэлектуальным развіцці. Педагагічная арганізацыя культурна-дасугавай дзейнасці здзяйсняецца на падставе выкарыстання ведаў шэрагу самастойных педагагічных дысцыплін: агульнай педагогікі, сацыяльнай педагогікі, псіхапедагогікі, дашкольнай, школьнай педагогікі і інш. Пры правядзенні культурна-дасугавай дзейнасці бібліятэкарам, працуючым з дзецьмі, мэтазгодна, на наш погляд, выкарыстоўваць такія агульнапедагагічныя прынцыпы, як мэтанакіраванасці, сістэматычнасці і паслядоўнасці, даступнасці, уліку ўзроставых і індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў, нагляднасці і інш.

Выкарыстанне такіх прынцыпаў, як прынцыпы педагагізацыі навакольнага сацыяльна-культурнага асяроддзя, асобаснага падыходу, арыентацыі на культурна-каштоўнасныя адносіны і арганізацыю культуратворчасці; прынцыпы культураадпаведнасці тэхналагічнага працэсу, апоры ў выкарыстоўваемых культурна-дасугавых тэхналогіях на нацыянальныя традыцыі, маральныя і эстэтычныя нормы паводзін, асаблівасці народнай творчасці, фальклора і г. д., будзе садзейнічаць развіццю творчасці дзяцей, падлеткаў, а таксама развіццю тэорыі і практыкі дасугу (Т. Р. Кісялёва, Ю. Д. Красільнікаў).

Мэтазгодна таксама ўлічваць спецыфічныя заканамернасці функцыянавання культурна-дасугавай дзейнасці. Спецыялісты надаюць сёння вялікую ўвагу тэхналагічным аспектам, кампанентам гэтай дзейнасці. Тэхналогія культурна-дасугавай дзейнасці разглядаецца імі як «навукова абаснаваная сістэма ведаў аб умовах, формах, метадах і прыёмах стварэння матэрыяльных і духоўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасцей, практычнае выкарыстанне якіх забяспечвае накіраванае ўздзеянне на духоўны свет асобы» [3, с. 100].

Здзяйсняючы тэхналогію культурна-дасугавай дзейнасці, персаналу дзіцячай бібліятэкі карысна, па нашым меркаванні, абапірацца на педагагічную тэхналогію, у значнай ступені распрацаваную Ю. П. Азаравым. На падставе даследаванняў ён прыйшоў да высновы, што «тэхналогія – гэта жорсткі разлік, напоўнены духоўным зместам. Педагог, распрацоўваючы тэхналогію… падпарадкоўвае ўсё развіццё самастойнасці выхаванню ў дзяцей высокай маральнасці» [1, с. 193]. Педагагічнае ўздзеянне ў дадзеным выпадку выступае ў ролі рэгулюючага фактару і ўздзейнічае на працэс культурна-дасугавай дзейнасці. Бібліятэчны персанал выкарыстоўвае пры гэтым комплекс метадаў і прыёмаў, уключаных у асобасна развіваючыя педагагічныя тэхналогіі: успрыманне літаратурных твораў, твораў мастацтва, гульнёвыя сітуацыі і г. д.

Педагагічна мэтазгодная арганізацыя дасугу ў дзіцячай бібліятэцы можа здзяйсняцца, на наш погляд, на аснове выяўлення дасугавых інтарэсаў дзяцей і магчымасці іх задавальнення, матываў іх удзелу ў дасугавай дзейнасці. Дзеля гэтага могуць выкарыстоўвацца такія метады, як анкетаванне, тэсціраванне, інтэрв’ю, гутаркі.

У кантэксце разглядаемай праблемы падкрэслім, што бібліятэка павінна інфармаваць дзяцей, кіраўнікоў дзіцячага чытання аб відах культурна-дасугавай дзейнасці, тэматыцы і змесце культурна-дасугавых мерапрыемстваў. У гэтых мэтах можа шырока выкарыстоўвацца прэстыжная бібліятэчная рэклама. У той жа час бібліятэкарам неабходна развіваць матывацыю дзяцей адносна праяўлення пазітыўнай актыўнасці ў выбары дасугавых форм баўлення вольнага часу.

Сёння пры ўсёй разнастайнасці тэхналагічных форм і зместу дасугавай работы з дзецьмі асноўная ўвага надаецца кнізе, паколькі бібліятэкі вызначылі сваю ролю ў развіцці, падтрымцы і захаванні цікавасці дзяцей да кнігі і чытання. У час наступлення віртуальнай культуры на традыцыйныя формы культурна-дасугавай дзейнасці гэта мэта становіцца надзвычай актуальнай. Праводзячы разнастайныя мерапрыемствы па далучэнні дзяцей да чытання, бібліятэкары кіруюцца маральным складнікам працэсу дзіцячага чытання, які сёння падтрымліваецца шэрагам навукоўцаў (А. Маслоу, К. Роджэрс, Э. Эрыксан і інш.). Безумоўна, рашэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гэтага пытання праз культурна-дасугавую дзейнасць патрабуе ад бібліятэчнага персаналу педагагічнай падрыхтоўкі, ведання псіхолага-педагагічнага развіцця дзіцяці, умелага выкарыстання крытэрыяў ацэнкі і адбору літаратурных твораў і дыферэнцаванай іх рэкамендацыі.

Падкрэслім таксама, што ў аснове правядзення разнастайнай культурна-дасугавай дзейнасці павінна быць педагогіка супрацоўніцтва. Менавіта праз яе і творчасць у культурна-дасугавай дзейнасці ствараецца педагагічна мэтазгодная арганізацыя вольнага часу асобы на ўсіх узроставых этапах. Паколькі педагагічнае ўздзеянне магчыма толькі ў выніку зносін, бібліятэчнаму персаналу неабходна дабівацца, каб любы яго кантакт з чытачамі адбываўся як педагагічны працэс.

Дасягнуць гэтага ў значнай ступені можа дапамагчы выкарыстанне педагагічных гульнёвых тэхналогій, якія сёння шырока прадстаўлены ў дзіцячых бібліятэках. Найбольш распаўсюджаным у гульнёвых тэхналогіях з'яўляецца метад спаборнасці, менавіта ён стымулюе да пошуку, своеасаблівых адкрыццяў. Найбольш эфектыўна адбываецца гэты працэс, калі ў яго ўключаецца сфера эмоцый.

Педагагічнае ўздзеянне на карыстальнікаў дзіцячых бібліятэк адбываецца і праз далучэнне да такой формы, як тэатралізацыя. Удзел дзіцяці ў тэатральнай дзейнасці ўзбагачае яго новымі ўражаннямі, ведамі, уменнямі, развівае інтарэс да літаратуры, назапашвае эмацыянальны вопыт, развівае культуру мовы, узбагачае слоўнікавы запас. Пры дзіцячых бібліятэках нашай краіны створаны тэатры кнігі, лялечныя тэатры, студыі, літаратурныя, мастацкія гурткі і аб'яднанні.

Для арганізацыі творчай культурна-дасугавай дзейнасці дзіцячыя бібліятэкі выкарыстоўваюць такія сучасныя формы, як дэбаты, дзень генія, майстар-класы, «падарожжа» па краінах свету, паэтычны лабірынт, прэс-марафон, ток-шоу, фестываль мастацтваў і інш. У арсенале бібліятэк і аўтаматызаваныя тэхналогіі, лепшыя рэсурсы медыя, што ў значнай ступені мяняе статус дзіцячай бібліятэкі ў сістэме пазашкольных дасугавых цэнтраў.

Вялікая ўвага надаецца таксама працы з сям'ёй, уключэнне якой у выхаваўча-адукацыйную сістэму з'яўляецца задачай грамадства. Вопыт работы дзіцячых бібліятэк краіны ў арганізацыі сямейнай культурна-дасугавай дзейнасці дастаткова багаты. Гэта створаныя пры бібліятэках «сямейныя творчыя аб'яднанні», кансультацыйныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэнтры дапамогі сям’і, работа мультымедыйных цэнтраў, стаўшыя традыцыйнымі сямейныя святы, дні сямейнага адпачынку, сустрэчы ў літаратурна-музычнай гасцёўні, прэс-канферэнцыі і інш.

Такім чынам, на падставе вышэйадзначанага можна канстатаваць, што ў дасугавай сферы заключаны вялікія выхаваўчыя і педагагічныя магчымасці, якія праяўляюцца на грунце выкарыстання культурных каштоўнасцей, назапашаных грамадствам. Данесці іх да дзяцей праз далейшую актуалізацыю тэматыкі, зместу, удасканаленне форм, метадаў і сродкаў дасугавай дзейнасці – адна з галоўнейшых задач дзіцячых бібліятэк, што спрыяе самаактуалізацыі, крэатыўнасці, фарміраванню каштоўнасных арыентацый падрастаючага пакалення.

---

1. *Азаров, Ю. П.* Искусство воспитывать / Ю. П. Азаров. – М., 1987.

2. *Божович, Л. И.* Проблемы формирования личности / Л. И. Божович. – Воронеж, 1995.

3. *Жарков, А. Д.* Технология культурно-досуговой деятельности : учеб. пособие / А. Д. Жарков. – М., 2002.

4. *Киселёва, Т. Г.* Социально-культурная деятельность / Т. Г. Киселёва, Ю. Д. Красильников. – М., 2004.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ